Источник: "Настаўніцкая газета" - 2015-03-24



# Багатае, насычанае, цікавае жыццё

## Да 70-годдзя з дня нараджэння Пятра Дзмітрыевіча Кухарчыка

**22 сакавіка 2015 года споўнілася б 70 гадоў вядомаму беларускаму вучонаму-радыёфізіку, грамадскаму дзеячу і педагогу, члену-карэспандэнту Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пятру Дзмітрыевічу Кухарчыку.**

П.Д.Кухарчык нарадзіўся ў вёсцы Арда Клецкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Цяжкасці пасляваеннага часу, нялёгкая вясковая праца, умовы жыцця ў шматдзетнай сям'і сфарміравалі характар Пятра, прымусілі яго рана пасталець. З ранніх гадоў у яго выпрацаваліся сур'ёзныя адносіны да вучобы. Яшчэ ў школе ён зразумеў, што яго любімыя прадметы — фізіка і матэматыка. Ужо стаўшы вядомым вучоным, Пётр Дзмітрыевіч неаднаразова з асаблівай удзячнасцю і цеплынёй успамінаў свайго настаўніка фізікі і матэматыкі Георгія Афанасьевіча Халецкага, які даў не толькі добрыя веды па прадмеце, але і сваім асабістым прыкладам дапамог стаць Чалавекам.

Пасля заканчэння школы Пётр Дзмітрыевіч паступіў у Мінскі электратэхнікум сувязі. Скончыўшы яго, быў прызваны на службу ў Савецкую Армію. Добрасумленна выконваючы свой абавязак перад Радзімай, ён не пакідаў жадання працягнуць навучанне і мэтанакіравана рыхтаваўся да паступлення ва ўніверсітэт.

Пасля дэмабілізацыі ў 1967 годзе малодшы лейтэнант П.Д.Кухарчык паступіў на аддзяленне радыёфізікі фізічнага факультэта БДУ. У гады вучобы ён займаўся навуковымі даследаваннямі ў студэнцкім навуковым таварыстве, актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці ўніверсітэта, узначальваў камсамольскую арганізацыю факультэта. Адным з яркіх успамінаў студэнцтва стала работа ў складзе будаўнічага атрада БДУ ў Германіі.

З верасня 1972 года па май 1990 года П.Д.Кухарчык працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам, старшым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам лабараторыі НДІ прыкладных фізічных праблем імя А.Н.Сеўчанкі БДУ, з 1989 па снежань 2000 года ўзначальваў кафедру радыёфізікі БДУ.

У 1977 годзе паспяхова абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук у БДУ, а ў 1988 годзе — доктарскую дысертацыю ў Маскоўскім інстытуце радыётэхнікі і электронікі.

З імем Пятра Дзмітрыевіча Кухарчыка звязана стварэнне асноў новага навуковага напрамку — даследаванне і распрацоўка галаграфічных метадаў у радыё- і інфрачырвоным, ЗВЧ- і аптычным дыяпазоне электрамагнітных хваль. П.Д.Кухарчык стварыў сістэму для пераўтварэння выяў інфрачырвонага і ЗВЧ-дыяпазонаў у бачныя, прапанаваў новы падыход па фарміраванні і візуалізацыі радыёвыяў. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам распрацаваны метады і створаны прыборы для вызначэння вільготнасці і масы дыэлектрычных матэрыялаў, укаранёныя на прадпрыемствах Беларусі і Расіі, развіты тэарэтычныя асновы ўзаемадзеяння электрамагнітных хваль з ненатуральнымі асяроддзямі, метады і алгарытмы запісу і апрацоўкі біямедыцынскіх і маўленчых сігналаў, створаны новыя радыёпаглынальныя матэрыялы.



Вынікі навуковых даследаванняў П.Д.Кухарчыка знайшлі адлюстраванне больш чым у 170 навуковых працах, у тым ліку ў манаграфіі "Сістэмы тэхнічнага зроку", у 42 аўтарскіх пасведчаннях і патэнтах. Пад яго кіраўніцтвам у Беларусі ўзнікла навуковая школа ў галіне радыёгалаграфіі і фізікі неразбуральнага кантролю, ён падрыхтаваў 8 кандыдатаў навук.

На працягу шэрага гадоў Пётр Дзмітрыевіч узначальваў савет па абароне доктарскіх дысертацый пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, быў старшынёй экспертнага савета Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў, членам бюро аддзялення фізікі, матэматыкі і інфарматыкі НАН Беларусі.

Навуковы патэнцыял П.Д.Кухарчыка, яго дасягненні ў галіне падрыхтоўкі кадраў, вынікі яго даследаванняў па заслугах ацэнены навуковай грамадскасцю. У 1990 годзе П.Д.Кухарчыку было прысвоена званне прафесара, а ў 1994 годзе ён быў выбраны членам-карэспандэнтам НАН Беларусі.

П.Д.Кухарчык не толькі вядомы вучоны, таленавіты арганізатар навукі, але і адзін з лідараў у справе развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі. Дзякуючы таленту і мэтанакіраванасці, яму ўдалося прайсці ўсе ступені адміністрацыйнага росту: загадчык навуковай лабараторыі, загадчык кафедры, першы прарэктар, намеснік міністра адукацыі, рэктар вышэйшых навучальных устаноў.

Працуючы на пасадзе прарэктара па вучэбнай рабоце, першага прарэктара БДУ з 1990 па 1996 год, намесніка міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2001 годзе, рэктара Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (2001—2003 гг.), П.Д.Кухарчык быў ініцыятарам адкрыцця новых спецыяльнасцей і спецыялізацый у галіне падрыхтоўкі кадраў вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі па спецыяльнасцях, неабходных для эканомікі нашай краіны. З'яўляўся адным з асноўных распрацоўшчыкаў дзяржаўнага стандарту па радыёфізіцы для ўстаноў вышэйшай адукацыі Беларусі.

З сакавіка 2003 года на працягу адзінаццаці гадоў П.Д.Кухарчык узначальваў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка. Яго галоўным дасягненнем у якасці рэктара стала захаванне ўніверсітэтам статусу вядучай вышэйшай педагагічнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі, удасканаленне вучэбнай і матэрыяльнай базы, павышэнне якасці адукацыі і навуковай работы ва ўніверсітэце. Дзякуючы ініцыятыве Пятра Дзмітрыевіча, 1914 год абгрунтавана стаў годам нараджэння нашай альма-матар. Імкнучыся зрабіць свой дом прыгожым, дагледжаным, добраўпарадкаваным, утульным і духоўна напоўненым, Пётр Дзмітрыевіч стварыў ва ўніверсітэце ўнікальную атмасферу павжлівасці і добразычлівасці.

Ён паспяхова арыентаваў работу прафесарска-выкладчыцкага складу БДПУ на ўдасканаленне вучэбна-выхаваўчага працэсу, укараненне новых адукацыйных тэхналогій, накіраваных на павышэнне якасці адукацыі. Доўгія гады з'яўляўся старшынёй савета Д 02.21.02 па абароне дысертацый пры БДПУ, галоўным рэдактарам навукова-метадычнага часопіса "Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка", намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Вышэйшая школа".

Заслугі ў педагагічнай, навуковай і арганізацыйнай дзейнасці П.Д.Кухарчыка адзначаны шматлікімі ўзнагародамі.

Шматгранная навуковая, адміністрацыйная, педагагічная дзейнасць дазволіла П.Д.Кухарчыку набыць каласальны вопыт. Кожны ўчастак работы даваў Пятру Дзмітрыевічу магчымасць не толькі набыць новыя кіраўніцкія навыкі, разглядаць пастаўленыя задачы аналітычна, думаць і дзейнічаць па-дзяржаўнаму, але і фарміраваць доўгатэрміновую стратэгію сваіх дзеянняў, несці прафесійную і чалавечую адказнасць за рашэнні, якія прымаюцца. Як у любога чалавека, які любіць сваю справу, яго прафесійная дзейнасць займала вялікую частку асабістага жыцця, адлюстроўвалася ў думках, эмоцыях, учынках.

Несумненна, партрэт юбіляра быў бы не поўны без яго асобасных якасцей. Пятра Дзмітрыевіча Кухарчыка характарызуюць не толькі высокія прафесійныя якасці і арганізатарскі талент, але і глыбокая прыстойнасць і сціпласць, дэмакратычнасць і адкрытасць, спакойны, удумлівы і прынцыповы падыход да вырашэння пастаўленых задач.

Безумоўна, што такое багатае, насычанае і цікавае жыццё Пятра Дзмітрыевіча не адбылося б без яго адзінай жонкі Людмілы Уладзіміраўны, якая цалкам прысвяціла сябе мужу і выхаванню дачок.

Крыху не дажыўшы да свайго 70-годдзя, Пётр Дзмітрыевіч пакінуў багатую спадчыну і добрую памяць сваім родным, блізкім, вучням, калегам, аднадумцам.

"Няма тых вяршынь, якія заваяваны навечна", — сказаў аднойчы Пётр Дзмітрыевіч свайму вучню.

На жаль, ён пайшоў нечакана і назаўсёды.

**А.І.ЖУК,**
**рэктар БДПУ,**
**А.І.АНДАРАЛА,**
**першы прарэктар БДПУ.**